«Перажывём. Не такое перажывалі»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Адмахвацца ні ад кога не трэба. Там, дзе трэба дапамагчы людзям, трэба дапамагчы», — адназначна выказаўся Аляксандр Лукашэнка.

У 2019 годзе кожны пяты зварот грамадзян, які паступіў у Адміністрацыю Прэзідэнта, датычыўся незадаволенасці работай камунальных службаў. Сёлета тэндэнцыя, на жаль, захоўваецца. Часцей за ўсё скардзяцца на якасць капітальнага і бягучага рамонту.

«І мы спакойна на гэта глядзім. Будаўнікі і іншыя робяць не проста няякасна — гэтак, нібыта наўмысна. Ну калі ты вырашыў адрамантаваць дах, дык зрабі, каб на галаву не цякла вада і каб людзі ў кватэрах тазікі не падстаўлялі ў дождж!» — кіраўнік дзяржавы быў катэгарычны.

А вось скаргі на неналежнае ўтрыманне пад'ездаў здзіўляюць Прэзідэнта, бо брудны пад'езд — гэта перш за ўсё праблема саміх жыхароў.

«Старшыня гар-, райвыканкама павінен мець у сябе армію людзей, якія будуць бачыць, будуць рамантаваць. І гэта «армія» — у ЖКГ. Гэта павінна быць сфера адказнасці мясцовых органаў улады», — перакананы Прэзідэнт.

Яшчэ адно непаразуменне людзей датычыцца добраўпарадкавання двароў і населеных пунктаў. На прывядзенне іх у парадак бюджэтныя грошы павінны выдаткоўвацца мінімальна, адзначыў Аляксандр Лукашэнка, гэта таксама сфера ініцыятывы саміх гараджан ці вяскоўцаў. Задача ўлады — арганізаваць жыхароў.

«Бюджэтныя грошы павінны ісці на больш істотныя мерапрыемствы кшталту капітальнага рамонту будынкаў, каналізацыі, цепла-трас», — размежаваў Прэзідэнт.

Шмат нараканняў паступае на работу нядаўна створанай службы 115. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што яна павінна знаходзіцца не ў ЖКГ, а ў райвыканкаме ці іншай арганізацыі.

«Мяркую, ва ўрадзе трэба самым сур'ёзным чынам паглядзець, як функцыяніце гэта служба. Каб тут не было фармалізму, каб яна працавала як хуткая дапамога... І трымаць на кантролі ўсе скаргі і звароты», — абазначыў падыходы кіраўнік краіны.

Праблемы галіны да канца не вырашаны, падсумаваў Прэзідэнт і заклікаў знайсці адказы на ўсе наяўныя пытанні.

ВАДА ДЛЯ ЖЫЦЦЯ

Намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Кухараў далажыў, што ў Беларусі забяспечана выкананне ключавых паказчыкаў развіцця галіны.

«Меры, якія прымаюцца, дазваляюць забяспечыць фарміраванне тарыфаў на паслугі ЖКГ у межах пяцідоларавага калідора — механізм празрысты і зразумелы для грамадзян. Па ўсіх паслугах, якія аказваюцца, за выключэннем падагрэву вады і ацяплення, забяспечана поўная акупнасць плацяжамі насельніцтва. Пакрыццё насельніцтвам выдаткаў па выніках бягучага года прагназуецца на ўзроўні 83,2 працэнта», — паведаміў віцэ-прэм'ер.

Да канца года плануецца выканаць даручэнне Прэзідэнта аб замене 11 300 ліфтаў. Да 2025 года ўсе карыстальнікі будуць забяспечаныя якаснай пітной вадой. У 2016—2018 гадах па Беларусі было пабудавана 60 станцый абезжалезвання, летась — 269. Сёлета плануецца ўвесці ў эксплуатацыю яшчэ 275. Доступ да якаснай вады дадаткова атрымаюць больш за дзвесце тысяч беларусаў, пераважна вяскоўцаў.

На мясцовых відах паліва ўжо працуе больш за 72 працэнты кацельняў сістэмы ЖКГ. Сёлета пачата будаўніцтва яшчэ 64 такіх кацельняў, праінфармаваў Уладзімір Кухараў.

ВЁСКА ЯК ПАРАТУНАК І АДДУШЫНА

Як правіла, Прэзідэнт у сваіх рабочых паездках не абмяжоўваецца адной тэмай. Яшчэ з верталёта Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на ход сельгасработ на Віцебшчыне. А потым запатрабаваў заняцца якасцю нарыхтоўкі кармоў.

«Вясна была незвычайная сёлета, і як ніколі зялёная Беларусь. Ну прыгажосць! — падзяліўся потым на нарадзе кіраўнік дзяржавы. — І апрацоўваць глебу пачалі лепш. Шмат яшчэ вузкіх месцаў, але я гляджу на нашы маленькія вёсачкі, хутары, неперспектыўныя вёскі, як раней іх называлі, на аграгарадкі — я бачу, колькі кінутых прысядзібных участкаў, дамоў, і думаю: вось пандэмія падштурхнула ж нас да таго, каб людзі пайшлі ў вёскі і пачалі скупляць гэтыя ўчасткі».

Прэзідэнт нагадаў сказанае ім раней: ***жывучы ў цэнтры Еўропы, не варта адмаўляцца ад прысядзібных участкаў.***

«Хто не хоча займацца, прадаюць за шалёныя грошы. І едуць да нас, у гэтыя вёскі, не толькі беларусы. Адкрываюць бізнес, працуюць, і ніхто не стогне, не плача, што ў нас дыктатура, што ў нас бязладдзе, што нам трэба сістэму мяняць...

Рэстаўратары працуюць у Спаса-Ефрасіннеўскім манастыры ў Полацку.

Фота БелТА.

Я хачу звярнуцца да беларусаў, каб яны не страцілі гэту магчымасць набыць у вёсцы, на аддаленым хутары кавалак зямлі, аднавіць дом ці пабудаваць невялікі, каб на выхадныя прыехаць, старых адвезці на нейкі час з гораду», — заклікаў кіраўнік дзяржавы.

Асабліва прыдасца кавалак зямлі ў выпадку магчымай другой хвалі эпідэміі каранавіруса, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«А калі ты нябедны, пабудуеш гэты дом — а там засталося тры-чатыры чалавекі, некаторыя пенсіянеры — заплаці ім, яны табе і дом дагледзяць, і людзі будуць пры справе. Таму на гэта неабходна звярнуць сёння сур'ёзную ўвагу. І нам трэба падглядзець, якія для гэтага неабходна прыняць рашэнні. Каб чалавек «надыбаў», як у народзе кажуць, гэту сядзібу невялічкую, і кажа: хачу купіць. Трэба зрабіць, каб ён імгненна пытанне гэта вырашыў. На месцах», — запатрабаваў Прэзідэнт.

ПЕРАД ЗАКОНАМ УСЕ РОЎНЫЯ

Пасля нарады Прэзідэнт падышоў да палачан, якія стыхійна сабраліся каля гарвыканкама.

Прэзідэнт адзначыў цяперашнюю эпідсітуацыю і тое, што ў Віцебскай вобласці з гэтай праблемай сутыкнуліся раней, чым у іншых рэгіёнах. З іншага боку, тыя, хто перахварэў, ужо могуць не баяцца ні другой, ні трэцяй хвалі з улікам набытага імунітэту. «Перажывём. Не такое перажывалі», — запэўніў ён.

Людзі задавалі Аляксандру Лукашэнку розныя пытанні, звярталіся з прыватнымі просьбамі. Па ўсіх іх Прэзідэнт даручыў разабрацца і аказаць неабходную дапамогу. У прыватнасці, гэта датычылася пытанняў шматдзетнай маці, вырашэння бытавых пытанняў.

Журналіст МТРК «Мір» пацікавілася ў кіраўніка дзяржавы яго меркаваннем пра падзеі вакол банка «Газпрама» ў Беларусі.

«Шчыра скажу, у нюансы пакуль не пагружаны. У дэталях не ведаю, што там адбываецца. Але я даручыў старшыні Камітэта дзяржкантролю (там фінансавая міліцыя гэтым займаецца). Цяпер у вялікіх аб'ёмах ідуць аператыўныя і следчыя мерапрыемствы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што на шляху ў Полацк у верталёце прачытаў асноўныя матэрыялы ў адносінах да банка і заявы. «Што мяне ўразіла: гэты нягоднік, інакш не назаву: я, маўляў, ні пры чым, да мяне прэтэнзій ніхто не мае, гэта яны там...» — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

«Слухайце, яны ўсе былі не толькі ў яго намеснікамі. Гэта адна шайка-лейка. Мы гэта бачым з 2016 года. Мы гэта бачылі. Навошта ж ты на іх валіш сёння? Ты быў кіраўніком, яны ў цябе намеснікамі. І ўсё, што там тварылася, магло без кіраўніка адбывацца? Не», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, ёсць поўная інфармацыя, што «гэта яго былі задумы, ён утварыў гэтыя структурныя пракладкі кшталту «Прыватлізінга».

«Працавалі па гэтым банку і па іх з 2016 года. Выявілі вывад грошай, замежныя рахункі, замежную ўласнасць іх. На Кіпры. У Латвіі рахункі, Лондане... — расказаў Прэзідэнт. — Але замежнікі інфармацыю нам (з 2016 года мы прасілі) далі толькі ў снежні мінулага года. Праваахоўныя органы актывізавалі гэтыя дзеянні. Таму з'явіліся пытанні».

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў задаць адпаведнаму чалавеку пытанне, чаму той хоча ісці ў прэзідэнты. ***«Калі рыльца ў пушку, не лезь туды. Таму што цябе замардуе сам народ.*** Чаго палез — таму што зразумеў, што да яго прыйдуць і надзенуць наручнікі. А ў нас жа цяпер выгадна займацца палітыкай, каб стаць вязнем сумлення. Вось чаму ён пайшоў туды. Але гэта яму не дапаможа», — заявіў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што гэты чалавек цяпер «крычыць: датычны — не датычны, улады ціснуць на некага...» ***«Як перад Богам клянуся, што мне гэта цяпер у перадвыбарчай кампаніі не трэба. Таму што будуць крычаць: баіцца некага...»*** — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. ***«Я нікога не баюся! І мне гэтая сітуацыя нявыгадная, але нягоднікаў трэба было спыняць, таму што пачалі хаваць канцы ў ваду. Не атрымалася»,*** — сказаў Прэзідэнт.

«І я хачу, каб ён трапіў на выбары. Каб ён прыйшоў і расказаў, адкуль уласнасць на Кіпры, як пры такой «лукашэнкаўскай дыктатуры» ён стварыў гэтую ўласнасць, як ён хабар даваў, дзяліў грошы, чаму замежны банк гэтым займаўся... Гэта ўсё трэба расказаць беларусам. І яны няхай потым вызначацца. Але вязнем сумлення мы яго не зробім», — сказаў Прэзідэнт.

Ён заявіў, што ў дадзеным выпадку па выніках расследавання будуць запрошаныя Інтэрпол і замежныя спецыялісты, каб яны прааналізавалі дакументы: «Расіян, амерыканцаў, еўрапейцаў — і аддам ім дакументы. І хай яны зробяць высновы на адпаведнасць дзеянняў праваахоўных органаў нашым законам». «Вы не думайце, што там з боку Лукашэнкі нейкі накат. Ніякага накату няма. Мне гэта цяпер і не трэба было», — запэўніў беларускі лідар.

Актуальны каментарый

Па выніках нарады на пытанні журналістаў адказалі прысутныя там спецыялісты.

Уладзімір КУХАРАЎ, віцэ-прэм'ер:

«Сёння быў разгледжаны ход выканання дырэктывы Прэзідэнта № 7 аб рабоце камунальнай гаспадаркі. Асноўныя кірункі паказалі, што ў цэлым усе задачы, якія ставяцца перад сістэмай, выконваюцца. Сістэмных праблем у галіне няма. Разам з тым тыя асобныя пытанні, што ўзнікаюць, былі абмеркаваны. Прэзідэнтам дадзены канкрэтныя даручэнні па іх выкараненні і прыняцці дадатковых мер. Акрамя таго, сёння Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на тым, што кіраўнікі мясцовых органаў улады павінны поўнасцю адказваць за тыя працэсы, што адбываюцца ў сістэме ЖКГ. Яны мусяць ажыццяўляць кантроль, таму што на галіне завязана практычна ўсё насельніцтва Рэспублікі Беларусь. І мясцовыя органы ўлады павінны не толькі ажыццяўляць кантроль, але і распрацоўваць стратэгію развіцця, кожны ў сваім рэгіёне, з улікам асаблівасцяў, якія там існуюць».

Андрэй ХМЕЛЬ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі:

«Кіраўнік краіны звярнуў асаблівую ўвагу на звароты грамадзян, якія датычацца капітальнага рамонту жылфонду ў краіне — гэта каля 40 працэнтаў усіх зваротаў. Таксама — на пытанні па добраўпарадкаванні дваровых тэрыторый. Асноўны пасыл, які кіраўнік дзяржавы даводзіў да прадпрыемстваў ЖКГ, — уважлівае стаўленне да людзей і іх праблем. Для таго каб іх паспяхова вырашаць, Прэзідэнт дае больш уласных паўнамоцтваў для рашэння пытанняў ЖКГ на месцах. Шмат удзялілі ўвагі простым спадзяванням грамадзян, канкрэтна — гэта праграма «Чыстая вада». Мы працягнем гэту работу, у будучай пяцігодцы яна будзе ўзмоцнена».

АДКРЫВАЮЧЫ ГІСТОРЫЮ НАНАВА

Пасля Прэзідэнт накіраваўся ў Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр. Там яго сустракалі ігумення Еўдакія і насельніцы манастыра. Віталі шаноўнага госця па царкоўнай традыцыі спевам званоў і па беларускай традыцыі — хлебам. Перад тым як расказаць пра нагоду і парадак візіту Прэзідэнта ў манастыр, крыху звернемся да гісторыі гэтага духоўнага комплексу, з якога бярэ пачатак развіццё хрысціянства і пісьменнасці ў нашай айчыне.

У комплекс уваходзяць тры храмы: старажытная Спаса-Праабражэнская царква, уключаная ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў, Свята-Крыжаўзвіжанскі сабор і Свята-Ефрасіннеўская царква. Менавіта ў Спаса-Праабражэнскім храме XII стагоддзя (з якога і пачалася гісторыя манастыра) гэтым часам ідзе маштабная рэканструкцыя. Царква, пабудаваная яшчэ пры жыцці заступніцы Беларусі Ефрасінні, змяшчае ўнікальныя фрэскі XII стагоддзя. Створаныя пры заснаванні храма, у пазнейшы час яны былі схаваны пад рэлігійным жывапісам іншых стагоддзяў. Але праз вякі старажытныя малюнкі пачалі праяўляцца. Чым не цуд? Фрэскі пазнейшых часоў вырашылі зняць. Распрацавала ўнікальную тэхналогію іх адслаення беларуска-расійская каманда рэстаўратараў. Для таго каб паглядзець, якім чынам ідуць работы, і завітаў Прэзідэнт.

Пра ход рэканструкцыі кіраўніку краіны далажыў міністр культуры Юрый Бондар. Ён адзначыў, што, пачаўшы работы ў 2015 годзе, зразумелі: амаль нічога нават спецыялісты не ведаюць пра гэту «жамчужыну» старажытнай беларускай архітэктуры. І расказаў пра некаторыя адкрыцці, зробленыя за гэты час.

«Высветлілася, што прывычны аб'ём храма, які дайшоў да нашых дзён, не з'яўляецца першапачатковым, — паведаміў Юрый Бондар. — Храм меў паўночную і паўднёвую галерэі — то-бок абсалютна іншую архітэктуру, чым прадстаўлена цяпер. Гэта быў велічны архітэктурны комплекс, пабудаваны ў візантыйскім стылі, пры будаўніцтве якога былі выкарыстаны ўнікальныя інжынерныя, архітэктурныя рашэнні, раней невядомыя ў старажытнай Русі».

Ён звярнуў увагу на тое, што тэхніка рэканструкцыі гэтага храма ўнікальная. Для таго каб скараціць тэрміны рэстаўрацыі, адначасова праводзяцца археалагічныя раскопкі. Прэзідэнт паразмаўляў і са спецыялістамі з Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, якія працавалі тым часам каля храма.

Асноўныя работы павінны скончыць у 2024 годзе, што будзе прымеркавана да 900-годдзя абіцелі ў 2025 годзе.

Аляксандр Лукашэнка таксама запаліў свечку ў Свята-Крыжаўзвіжанскім саборы і прылажыўся да мошчаў святых. Дарэчы, рака са срэбра, дзе змяшчаюцца мошчы святой Ефрасінні Полацкай, больш за 10 гадоў таму была выраблена дзякуючы падтрымцы дзяржавы і Прэзідэнта асабіста. Стоячы каля праваслаўнай рэліквіі, кіраўнік краіны выказаў спадзяванне, што заступніца дапаможа Беларусі.

Варвара МАРОЗАВА, Марыя ДАДАЛКА,
г. Полацк.

❍ Дарэчы

ГЛЫБІНЯ ПЕРАПРАЦОЎКІ НАФТЫ ПАВЯЛІЧЫЦЦА ДА 90 %

У чацвер, 11 чэрвеня, спікер верхняй палаты парламента Наталя КАЧАНАВА наведала адкрытае акцыянернае таварыства «Нафтан».

Як паведамляе БелТА, яна сустрэлася з калектывам гэтага прадпрыемства. Падчас сустрэчы супрацоўнікі змаглі задаць пытанні, якія іх цікавяць, і з першых вуснаў даведацца пра асноўныя кірункі дзяржаўнай палітыкі ў розных сферах. Абмяркоўваліся работа эканомікі, пытанні жылля, заробкаў, транспартнай інфраструктуры і электратранспарту. Сустрэча прайшла ў адкрытай і даверлівай атмасферы.

Наталля Качанава падкрэсліла, што трымае на кантролі працэс мадэрнізацыі завода, работы выходзяць на фінішную прамую. У выніку плануецца павялічыць глыбіню перапрацоўкі нафты да 90 %. Інвестпраграма ўключае комплекснае развіццё прадпрыемства, стварэнне новых вытворчасцяў і рэканструкцыю дзеючых пляцовак. «Нафтан» ужо завяршыў рэканструкцыю ўстаноўкі першаснай перапрацоўкі нафты АТ-8.

Як адзначыў **генеральны дырэктар ААТ «Нафтан» Аляксандр ДЗЯМІДАЎ,** на заводзе працягваецца праграма па пастаўках альтэрнатыўнай нафты. «Сёння ўпершыню прыбыла амерыканская нафта гатунку Bakken сланцавага паходжання. За апошнія 5-6 месяцаў гэта трэці гатунак нафты, які тут раней не перапрацоўвалі. Спачатку паступала нарвежская нафта, пасля арабская. Дыверсіфікацыя паставак сёлета працягнецца», — паведаміў ён.

Па ацэнках спецыялістаў, амерыканская нафта па сваіх характарыстыках не саступае гатунку Urals. «Чорнае золата» з ЗША мае вышэйшы патэнцыял утрымання светлых нафтапрадуктаў.

Амерыканская нафта стала 12-й танкернай пастаўкай у гэтым годзе для Беларусі ад альтэрнатыўных пастаўшчыкоў. Агульны аб'ём танкерных паставак нафты перавысіў мільён тон.

Блізкая ўлада

ЛЬГОТНАЕ ЖЫЛЛЁ, ДАРОГІ І ЗАРПЛАТА

Што яшчэ хвалюе жыхароў Міншчыны

Заяўнікаў з усіх куткоў цэнтральнага рэгіёна выслухаў памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ падчас тэлефоннай лініі ў Мінаблвыканкаме.

Анатоль Іванавіч з Чэрвеня паскардзіўся, што вуліца Гагарына, дзе ён жыве, у нездавальняючым стане. Сёлета ў Чэрвені пройдуць абласныя «Дажынкі», і Ігар Яўсееў запэўніў, што ў межах падрыхтоўкі да свята выедзе на месца, каб ацаніць маштабы работ, а таксама даручыць выправіць праблему, якая хвалюе заяўніка.

У Людмілы Віктараўны з Заслаў'я падтопліваецца ўчастак. Справа ў тым, што на дарозе няправільна пакладзена труба, таму сцёкавыя воды трапляюць у агарод гаспадыні. Куды толькі ні звярталася жанчына, а воз і сёння тут. Ігар Яўсееў паабяцаў выехаць на месца і прыняць неабходныя меры па выпраўленні становішча.

Зінаіда Аляксандраўна з вёскі Краснае Маладзечанскага раёна расказала, што побач з яе домам знаходзіцца ўчастак, які пустуе каля пяці гадоў. Яго гаспадар — інвалід, жыве ў інтэрнаце. Зямля зарасла быльнягом, з'явіўся хмызняк. Ігар Яўсееў запэўніў, што пытанне будзе вырашана: ён звяжацца са старшынёй сельвыканкама і высветліць, хто павінен даглядаць участак, — магчыма, у домаўладальніка ёсць сваякі.

Работнік БелАЗа Андрэй Уладзіміравіч з жонкай выхоўваюць чатырох непаўналетніх дзяцей. Шматдзетная сям'я будуе льготнае жыллё ў Жодзіне. Але яны не могуць прэтэндаваць на 120 квадратных метраў. Справа ў тым, што мужчына прадаў стары, не прыдатны для жыцця дом плошчай 47 «квадратаў» у вёсцы. Як адказваюць у розных інстанцыях, ён не мае права на субсідыю на такі метраж. Ігар Яўсееў запэўніў, што падключыць юрыстаў, а пытанне возьме на асабісты кантроль.

— У асноўным звяртаюцца людзі з бытавымі пытаннямі, — паведаміў Ігар Яўсееў журналістам. Часам дакументы даводзіцца накіроўваць у пракуратуру, як у выпадку з размеркаваннем жылля ў новым доме, пабудаваным для медыкаў.

Людзі звяртаюцца са сваімі праблемамі на тэлефонныя лініі, таму што давяраюць Прэзідэнту і яго памочнікам, лічыць Ігар Уладзіміравіч. Сёння на кантролі памочніка Прэзідэнта шмат пытанняў: аздараўленне дзяцей, будаўніцтва дзіцячых садкоў і школ, своечасовая выплата заработнай платы. «Гэта важнае пытанне, якое паставіў кіраўнік дзяржавы, — падкрэсліў Ігар Яўсееў. — На Міншчыне ўсяго тры прадпрыемствы, дзе заробкі меншыя за 600 рублёў. І мы разбіраемся, чаму».

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Мерапрыемствы ў рэгіёнах з удзелам кіраўнікоў Адміністрацыі Прэзідэнта працягнуцца. Падчас выязных прыёмаў з іх удзелам грамадзяне змогуць асабіста данесці свае праблемы да кіраўнікоў высокага ўзроўню, а таксама абмеркаваць пытанні, якія датычацца актуальных аспектаў развіцця іх малой радзімы і краіны ў цэлым. Для тых, хто з якіх-небудзь прычын не можа прыйсці на сустрэчу асабіста, падчас выездаў будуць арганізаваны прамыя тэлефонныя лініі. Нумары тэлефонаў размешчаны на сайтах мясцовых органаў улады, а таксама ў сродках масавай інфармацыі.

16 чэрвеня ў Слуцкім райвыканкаме ў 10 гадзін пачне працаваць на выязным прыёме першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Уладзіміравіч РЫЖАНКОЎ. 17 чэрвеня ў Астравецкім райвыканкаме з 10 да 12 гадзін будзе праходзіць прамая тэлефонная лінія з намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэем Міхайлавічам КУНЦЭВІЧАМ, а з 12 гадзін пачнецца асабісты прыём. У гэты ж дзень у Бярозаўскім райвыканкаме будзе працаваць начальнік галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Рыгор Іванавіч ШЛЫК: з 10 да 12 гадзін — на прамой тэлефоннай лініі, а з 12.00 — на асабістым прыёме.

УВАГА!
ПАСТУПАЕМ У АСПІРАНТУРУ І ДАКТАРАНТУРУ

Учреждение образования
«Белорусский государственный экономический университет»
ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ НА 2020 ГОД
по следующим отраслям науки и соответствующим специальностям за счет средств республиканского бюджета и на платной основе

АСПИРАНТУРА*

Специальность	Форма получения образования: дневная	заочная	соискательство
08.00.00 – Экономические науки			
08.00.01 – экономическая теория	2	—	1
08.00.05 – экономика и управление народным хозяйством	9	—	1
08.00.10 – финансы, денежное обращение и кредит	2	—	—
08.00.12 – бухгалтерский учет, статистика	—	1	1
08.00.13 – математические и инструментальные методы экономики	1	—	1
08.00.14 – мировая экономика	3	—	1
12.00.00 – Юридические науки			
12.00.02 – конституционное право; конституционный процесс; муниципальное право	1	—	—
12.00.03 – Гражданское право; предпринимательское право; семейное право; международное частное право	1	—	—
12.00.05 – Трудовое право; право социального обеспечения	1	—	—
23.00.00 – Политические науки			
23.00.02 – политические институты, процессы и технологии	1	—	—

**Указано количество мест для получения образования за счет средств республиканского бюджета.*

Освоение содержания образовательной программы аспирантуры осуществляется: в дневной форме получения образования — 3 года, в заочной форме получения образования — 4 года, в форме соискательства — до 5 лет. Поступающие в аспирантуру на дневную и заочную форму получения образования должны сдать кандидатские экзамены и зачеты по общеобразовательным дисциплинам до поступления.

ДОКТОРАНТУРА*

Специальность	Форма получения образования: дневная	соискательство
08.00.00 – Экономические науки		
08.00.05 – экономика и управление народным хозяйством	5	2
08.00.10 – финансы, денежное обращение и кредит	1	—
08.00.12 – бухгалтерский учет, статистика	1	1
08.00.13 – математические и инструментальные методы экономики	1	—
08.00.14 – мировая экономика	1	—

**Указано количество мест для получения образования за счет средств республиканского бюджета.*

Освоение содержания образовательной программы докторантуры осуществляется: **в дневной форме получения образования — 3 года, в форме соискательства — до 5 лет.**

Прием лиц для получения послевузовского образования осуществляется в порядке, определенном Положением о подготовке научных работников высшей квалификации в Республике Беларусь (Указ Президента Республики Беларусь от 01.12.2011 № 561).

Лица, поступающие в аспирантуру и докторантуру БГЭУ, предварительно проходят собеседование на профильных кафедрах.

Подготовка научных работников высшей квалификации осуществляется на договорной основе.

Зачисление в аспирантуру и докторантуру БГЭУ — **1 ноября 2020 года.**

По вопросам поступления в аспирантуру и докторантуру БГЭУ обращаться:
220070, г. Минск, пр-т Партизанский, 26, учебный корпус 6, комн. 17.

Тел.: **(+375 17) 209-78-85** E-mail: **aspirantura@bseu.by**

Прием документов в аспирантуру и докторантуру
с 1 августа по 30 сентября 2020 года (кроме субботы, воскресенья).
Время работы приемной комиссии: с **9.00** до **12.30** и с **14.00** до **16.30**.

Проезд: трол. 3, 15, 16, 17, 34, 41, авт. 59, 79, 93 до ост. «Площадь Ванеева».

УНП 100015608

Учреждение образования
«АКАДЕМИЯ МИНИСТЕРСТВА ВНУТРЕННИХ ДЕЛ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ»
В 2020 ГОДУ В АДЪЮНКТУРУ АКАДЕМИИ МВД ПЛАНИРУЕТСЯ ОСУЩЕСТВИТЬ ПРИЕМ НА СЛЕДУЮЩИЕ СПЕЦИАЛЬНОСТИ:

✓ **на дневную форму получения образования:** 12.00.08 – уголовное право и криминология; уголовно-исполнительное право (2 места), 12.00.09 – уголовный процесс (1 место), 12.00.12 – криминалистика; оперативно-розыскная деятельность (7 мест), 12.00.14 – административное право; административно-деликтное право; административный процесс (1 место), 19.00.06 – юридическая психология (1 место);

✓ **на заочную форму получения образования:** 12.00.02 – конституционное право; конституционный процесс; муниципальное право (1 место), 12.00.03 – гражданское право; предпринимательское право; семейное право; международное частное право (1 место), 12.00.12 – криминалистика; оперативно-розыскная деятельность (6 мест).

Срок обучения в дневной форме – 3 года, в заочной – 4 года, в форме соискательства – 5 лет, в форме соискательства в целях сдачи кандидатских экзаменов и зачетов по общеобразовательным дисциплинам – 2 года.

Право на поступление в адъюнктуру Академии МВД предоставляется сотрудникам органов внутренних дел, не достигшим на момент зачисления 36 лет (дневная форма обучения), имеющим диплом о высшем образовании, склонность к научным исследованиям, опыт практической работы не менее трех лет в должности среднего и старшего начальствующего состава, положительно зарекомендовавшим себя по службе, сдавшим кандидатские экзамены и зачет по общеобразовательным дисциплинам до поступления в адъюнктуру. Отбор кандидатов на поступление в адъюнктуру возлагается на соответствующие профилирующие кафедры Академии МВД.

В докторантуру Академии МВД (**дневная форма получения образования**) планируется осуществить прием по специальности 12.00.01 – теория и история права и государства; история учений о праве и государстве (1 место).

Подробнее о приеме в адъюнктуру и докторантуру можно узнать на сайте Академии МВД (**www.amia.by**) или по телефону **(8 017) 289-21-40.**
Адрес: **220005, г. Минск, пр-т Машерова, 6.**

УНП 100926541

Учреждение образования
«Белорусский государственный университет физической культуры»
ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ НА 2020 ГОД
по следующим отраслям наук и соответствующим специальностям за счет средств республиканского бюджета и на платной основе

АСПИРАНТУРА*

Специальность	Форма получения образования: дневная	заочная	соискательство
03.00.00 – Биологические науки			
03.03.01 – физиология	1	—	—
03.03.02 – антропология	2	—	2
13.00.00 – Педагогические науки			
13.00.04 – теория и методика физического воспитания, спортивной тренировки, оздоровительной и адаптивной физической культуры	8	8	4

**Указано количество мест для получения образования за счет средств республиканского бюджета.*

Освоение образовательной программы аспирантуры осуществляется: в дневной форме получения образования — 3 года, в заочной форме получения образования — 4 года, в форме соискательства — до 5 лет. Поступающие в аспирантуру на дневную и заочную форму получения образования должны сдать кандидатские экзамены и зачеты по общеобразовательным дисциплинам до поступления.

ДОКТОРАНТУРА*

Специальность	Форма получения образования: дневная	соискательство
13.00.00 – Педагогические науки		
13.00.04 – теория и методика физического воспитания, спортивной тренировки, оздоровительной и адаптивной физической культуры	2	—

**Указано количество мест для получения образования за счет средств республиканского бюджета.*

Освоение образовательной программы докторантуры осуществляется: в дневной форме получения образования — 3 года, в форме соискательства — до 5 лет.

Прием лиц для получения послевузовского образования осуществляется в порядке, определенном Положением о подготовке научных работников высшей квалификации в Республике Беларусь (Указ Президента Республики Беларусь от 01.12.2011 № 561).

Подготовка научных работников высшей квалификации осуществляется на договорной основе.

Зачисление в аспирантуру и докторантуру БГУФК — **1 ноября 2020 года.**

По вопросам поступления в аспирантуру и докторантуру БГУФК обращаться:
220020, г. Минск, пр. Победителей, 105, кабинет 550.

Тел.: +375 17 3775355 **E-mail: aspirantura@sportedu.by.**

Прием документов в аспирантуру и докторантуру
с 1 августа по 30 сентября 2020 года.

УНП 100007545

УНП 100160307
ООО «ФЭК» СООБЩАЕТ
о проведении 14.07.2020 торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества:

- Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7127413, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35а-302 – 451 474,10 белорусского рубля.
- Здание приемного пункта стеклотары с инвентарным номером 500/С-25845, расположенного по адресу: г. Минск, пр-т Пушкина, 29а – 129 647,91 белорусского рубля.

Подробную информацию можно узнать на сайте bankrot.gov.by.